Przesyłka opłacona ryczałtem

№ 1 (30) Серада 12-га студня, 1927 г. м Вільня Год II

…СКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адраджэньне.—Тэрыторыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмакратызм.—Барацьба з комунізмам.—Нацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
„ „ „ 3 „ 2 зл. 50 гр.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Fabryczna 39.
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—20 гр.
за радок нонпарэля.

Крызіс сацыялізму.

Хто з нас у даўнейшыя вучнёўскія і студэнцкія гады не захапліваўся сацыялістычнай доктрынай? Хто з нас не браў удзелу ў дэмонстрацыях, або ў забастоўках? Усе мы грэшны ў гэтым! Колькі было ў б. Расеі розных адценкаў сацыялістычных партыяў? І эсдэкі бальшавікі, і незалежныя сацыялісты і народныя сацыялісты, а сярод самых эсэраў дык была нават ажно тры кірункі: левыя, цэнтравікі і правыя. Усе гэтыя партыі былі і ў нашай беларускай, нялічнай у тыя часы, інтэлігэнцыі з дадаткам яшчэ групы сацыялістаў—фэдэралістаў. Дзе ўсё гэта сяньня? Дзе гэтыя партыі, дзе іх ідэя і жывая сіла? Згінулі! Засталіся, як тыя дрэвы бяз лісьцяў, толькі ствалы — розная „лідэры" без партыяў і „партыі" без сяброў, якія нікому не патрэбны і нудны з сваімі абрыдлымі „ідэямі" і сваімі аджыўшымі штампаванымі душамі. Што ж такога здарылася, што забіла ідэі, за якія йшлі на сьмерць сотні і тысячы ідэйных людзей, што стала, што яшчэ нядаўнія куміры і ўсе гэтыя правадыры і лідэры, раптам зваліліся з свайго надта высокага педэсталу?

Гэта зрабіла жыцьцё! Сацыялізм—як ідэя інтэрнацыянальная, аказаўся непрымянімым на зямлі перад усім дзеля таго, што ён пайшоў проціў самае прыроды і яе законаў. Матка любіць сваё дзіця, дзіця сямью, і кожны чалавек свой народ, сваю Бацькаўшчыну. Іначай кажучы ідэя любові да Бацькаўшчыны — *ідэя нацыянальная* выцякае з самай прыроды чалавека. Вось дзеля чаго перад усім ідэя сацыялістычная, як інтэрнацыянальная, пацярпела ўва усіх краях сьвету крах. Бо проціў яе выступіла ідэя нацыянальная. Другою прычынай, прыблізіўшай і абвастрыўшай крызіс сацыялізму, была комуністычная зараза—гэтае enfant terrible (пачварнае дзіця) сацыялізму. Усе тыя доктрыны, якія высоўваліся сацыялістамі і пекна выглядалі ў тэорыі—комуністы папрабавалі ўвясьці ў жыцьцё і.. опыт аказаўся страшэнным! Тое, што мы бачым сяньня ў Савецкім Саюзе ёсьць жывым прыкладам таго, што робіцца з ідэяй сацыялізму, калі яе пачынаюць правадзіць у жыцьцё.

Праўда—ў гэтым ані водная сацыялістычная партыя не прызнаецца, бо з за рамак сваіх праграмаў ня бачыць жыцьця, але гэта надта добра відна усім нам—не сацыялістам.

Але ня толькі фактары нацыянальныя давялі да крызіса сацыялізм, як ідэю інтэрнацыянальную. Сацыялізм збанкрутаваў адначасова і як ідэя сацыяльная. Сацыялізм ня змог перадужаць другога закону прыроды — закону ўласнасьці; бо навят кожная жывёла і зьвер мае *свае ўласнае* логавішча ці жыльлё. Аднак жа сацыялізм стаў перажываць рашучы крызіс толькі тагды, калі ўсьлед за відавочнымі яго нэгатыўнымі старанамі, была выстаўлена апрача ідэі нацыянальнай і прынцыпу ўласнасьці—практычная сыстэма барацьбы з сацыялізмам.

Гэта сталася, калі вялікім чалавекам нашых дзён Муссаліні першым гэтая практычная сыстэма была ўведзена ў жыцьцё. Ен першы *меў адвагу* паставіць усе кропкі над і, выступіўшы рашуча на барацьбу не толькі з комунізмам, але і з бацькам комунізму сацыялізмам незалежна ад таго якіх бы адценкаў ён ня быў.

І мы бачым, што прыклад Муссаліні маланкай перакінуўся ў іншыя краі. І гэта не дзеля таго, што Муссаліні ўвёў нейкую новую ідэю — а дзеля таго, што гэтая ідэя, гэтая—практычная сыстэма барацьбы з комунізмам і сацыялізмам і будаваньне дзяржавы на падставах нацыянальных і не клясовай барацьбы, а згоды усіх клясаў аднаго народу — аказалася роўна *дасьпеўшай* патрэбай для ўсіх іншых дзяржаваў і народаў. Фашызм Муссаліні перанесься да Польшчы, прыняўшы праўда свае характэрныя рысы. Нядаўна мы былі сьведкамі фашыстаўскага перавароту ў Літве. І напэўна будзем сьведкамі не аднага яшчэ гэткага *выпадку*.

Сацыялізм выступіў проціў законаў прыроды і пацярпеў крах, уступаючы свае мейсца іншым ідэям, якія законы прыроды кладуць у падваліны крэпасьці, культурнага разьвіцьця і шчасьця паасобных дзяржаваў і народаў.

Палітычны агляд.

Наколькі яшчэ не зраўнаважана палітычна Эўропа, выразна паказвае апошні нямецка-італьянскі арбітражны трактат, падпісаны перад самым Новым Годам у Рыме. Усе прад'уступныя гутаркі між немцамі і італьянцамі па гэтаму поваду трымаліся ў строгай тайне. І гэты сюрпрыз быў паднесяны Эўропе ў Жэнэве падчас апошняй сэсіі Рады Лігі Народаў у пачатку сьнежня. Трэба заўважыць, што ўсе такія неспадзянкі з немцамі зьяўляюцца на сьвет падчас якіх—небудзь міжнародных зьездаў ці кангрэсаў. Гэтак было з Рапальскім трактатам у Гэнуі, бэрлінскім у Лёкарно, Туары ў Жэнэве і цяпер падчас сэсіі Рады Лігі Народаў, на якой разглядаліся гэткія важныя пытаньня, як разбраеньне Нямеччыны, было заяўлена аб нямецка-італьянскай згодзе.

Гэты дыплёматычны акт мае вельмі вялізарнае значэньне для будучага ўклада як палітычных, гэтаксама і эканамічных адносінаў у Заходняй Эўропе. Ужо адзін факт саўпадзеньне гэт га акту з вельмі важнай сэсіяй Рады Лігі Народаў у Жэнэве часткаю адкрывае яго мэты і значэньне. Мінулы год, як ведама, прайшоў пад знаком нямецка французскага зьбліжэньня, этапамі на шляху да якого былі Лёкарно, Туары і жалезнасталёвы трэст. Аднача сна вельмі папсаваліся палітычныя адносіны паміж Францыяй і Італіяй. На француска-італьянскай граніцы да гэтай пары яшчэ стаяць амаль што ў баявой спраўнасьці вялікія вайсковыя часьці. Для Італіі, маючай вельмі многа спрэчных пытаньняў з Францыяй, не магло спадабацца француска нямецкае збліжэньне, грунт для якога быў заложаны ў Туары. Дзеля гэтага Муссаліні як цьвярозы і рэальны палітык, не разьбіраючыся ў спосабах для дасягненьня накрэсьляных мэтаў, рашыў зусім разьбіць, або хоць значна аслабіць нямецка - француское збліжэньне зьвязываючы Італію з Нямеччынай Гэткі кірунак італьянскай палітыкі дыктуецца жыцьцёвымі інтарэсамі Італіі, хварэючай, падобна Нямеччыне, збыткам насяленьня Італія патрабуе н о в ы х тэрэнаў для эміграцыі, якія можа знайсьці толькі ў францускіх калёніях, як менш патрэбных Францыі, хварэючай дэгэнерацыяй ці выраджэньнем. А дзеля таго, што збліжэньне ці хаўрус Францыі з Нямеччынай мог бы зашкодзіць дасягненьню гэтай мэты, дык Муссаліні і прапанаваў немцам сваю дружбу, тым больш, што Італія ня мае ніякіх спрэчных інтарэсаў з Нямеччынай. Нават наадварот, вонкавая палітыка Нямеччыны зусім ідэнтычна з італьянской, асабліва ў пытаньні аб калёніях і эміграцыі. У гэтым кірунку немцы, як не маючыя цяпер уласных калёніяў, могуць толькі падтрымаць італьянцаў у іх дамаганьнях атрымаць ад Лігі Народаў мандат на якую небудзь з азіяцкіх ці афрыканскіх калёніяў, лічачы на узаемную дапамогу з боку італьянцаў. Гэткім чынам італьянска нямецкае збліжэньне зусім касуе лёкарнска-туарыйскую палітыку Францыі.

Але крыху інакш на гэтую справу паглядзелі немцы Яны добра пераканаліся ў тым, што дзе двох б'ецца—там карыстае толькі трэці. Яны вельмі шмат скарысталі з ангельска-радавай барацьбы і цяпер ахвотна могуць пайсьці на спатканьне італьянскім прапазыцыям, каб скарыстаць з італьянска-францускага канфлікту. Апрача таго, што немцы могуць лічыць на помач з боку італьянцаў на тэрэне Лігі Народаў у будучыне, яны ужо нават атрымалі перамогу ў Жэнэве дзякуючы гэтаму трактату, зрабіўшаму пяруновае ўражаньне на ўсіх сяброў Рады Лігі Народаў. Пытаньне аб скасаваньні ваеннага кантроля хаўрусьнікаў над Нямеччынай было вырашана так, як гэтага хапелі самі немцы. Гэты кантроль з 1 лютага касуецца і перадаецца ў рукі Лігі Народаў, у якой немцы будуць мець ня менш сваіх прыхільнікаў, чым Англія і Францыя разам узятыя. Але ня дойдзе да спрэчак між Францыяй і Англіяй з аднаго боку і Нямеччынай з другога. Наадварот трэба чакаць, што Англія і Францыя пойдуць яшчэ на большыя канцэсіі на карысьць Нямеччыны каб толькі не дапусьціць да стварэньня новага „трайнога" нямецка-радава-італьянскага хауруса.

Зусім у аналагічным кірунку разьвіваецца і ўнутраны нямецкі палітычны крызіс, які цягнецца ад палавіны мінуўшага месяца і праходзіць гэтак сама пад знаком таргоўлі з хаўрусьнікамі. Трэба адцеміць, што пасьля апошніх выбараў рэйхстаг ня можа стварыць моцнай ўрадавай большасьці. Да часу Лёкарна існавала цэнтра-правая большасьць. Але каб не рабіць нямецкай дыплёматыі ў Лёкарно перашкодаў, нацыяналісты вышлі з урадавай коаліцыі і ўвесь гэты час нямецкі Урад апіраўся на цэнтральную меншасьць, складаючуюся з народнай партыі міністра Штрэзэмана, правае крыло якой цягне да нацыяналістаў, каталіцкага цэнтру канцлера Маркса і дэмакратаў, прымыкаючых крыху да сацыял дэмакратаў. Зусім зразумела, што ўрад Маркса — Штрэзэмана, апіраючыся на меншасьць, мусіў лавіраваць між нацыяналістамі і сац.-дэмакратамі, як, с а м ы м і м о ц н ы м і дзьвюмя п а р т ы я м і, якія супольным пераходам у апазыцыю маглі адразу скінуць урад. Гэтак і здарылася ў палове сьнежня пасьля жэнэўскай сэсіі Рады Лігі Народаў. Таўчок гэтаму далі сацыялісты рашуча выступіўшы проці міністра рэйхсвэры (войска) Геслера, паходзячага з дэмакратаў, які падтрымліваў кантакт між рэйхсвэрай і нацыяналістычнымі ваенна-спартыў-

ными арганізацыямі. Масла да гэтага падлiў ангельскі гэнэрал Морган, быўшы сябра ваенна-кантрольнай камісіі хаўрусьнікаў у Нямеччыне. Паводле заявы гэн. Моргана Нямеччына мае ў аднэй Кэнігсбэрскай крэпасьці каля 4,000 штук гармат цяжкага і сярэдняга калібру, якіх хопіць для ўзбраеньня 35 палявых дывізіяў. Гэтак сама і ўсе іншыя крэпасьці на ўсходзе Нямеччыны служаць арсэналам дла склада аружжа. Апрача таго з Нямеччыны бязупынна ідуць транспарты ваенных матэрыялаў да Радавай Расеі Гэтыя самыя весткі падцьвярдзіў у сваей прамове ў рэйхстаге прадстаўнік і лідэр сац. дэмакратаў пасол Шэйдэман. Ен яшчэ дабавіў шмат ад сябе аб узбраеньні рэйхсвэры, чаго няведаў акружаючы сьвет. Зусім зразумела, што такая прамова не магла спадабацца намецкім нацыяналістам і нават умяркованым партыям цэнтра І калі дайшло да галасаваньня над вотумам даверра кабінэту Маркса, дык сацыялісты разам з нацыяналістамі выступілі проці, выходзячы з розных паглядаў і скінулі ўрад Цяпер нацыяналісты разьвілі нязвычайную энэргію, каб перацягнуць на свой бок цэнтр і баварскую народную партыю і ствaрыць цэнтра-праваю большасьць. Зусім магчыма, што ім гэта і ўдалося бы, калі-б ня трэба было лічыцца з вонкавымі фактарамі. Амаль ня ўся Эўропа сачыць за вынікамі гэтага крызіса, ад яго будзе залежыць ня толькі форма дзяржаўнага строю ў Нямеччыне, але і далейшы кірунак агульна-эўрапэйскай палітыкі Хаўрусьнікі з вялікай ўвагай сачаць за разьвіцьцём нямецкага палітычнага крызісу, ад вынікаў якога залежыць доля будучага спакою. Калі толькі ўлада не пападзе ў рукі нацыяналістаў, Нямеччына можа рахаваць на скорую эвакуацыю Прырэйнскай вобласьці і палегкаў у сплаце ваенных даўгоў і рэпарацыяў.

І ў гэтым выпадку для нямецкай дыпляматыі адкрываецца магчымасьць таргоўлі з пераможцамі Калі толькі будзе карысна, нямецкія нацыяналісты могуць яшчэ на нейкі час устрымацца ад улады, дкя карысьці дзяржавы, як гэта яны зрабілі перад Лёкарнам.

N.

Апошнія навіны.

У Польшчы.

Арганізацыя ўкраінскага школьніцтва. „Dziennik Lwowski“ паведамляе што ў украінскіх колах Львова атрымана вестка з Прагі Чэскай, аб конфэрэнцыі Голувкі, экспэрта па справам Нацыянальных Меншасьцяў у палітычным кабінэце Рады Міністраў з украінскімі прафэсарамі. Конфэрэнцыя скончылася пазытыўным вынікам

На конфэрэнцыі абгаварываліся ўкраінскія школьныя справы.

Украінскія вучоныя згадзіліся прынцыпова на арганізаваньне ўкраінскага ўнівэрсытэту ў Польшчы. Голувко абяцаў украінскім вучоным, што ўрад дасьць рад канцэсіяў у галіне ўкраінскага школьніцтва—сярэдняга і ніжэйшага.

Міністар Славой — Складкоўскі аб нацыянальных меншасьцях Міністар унутраных справаў Славой — Складкоўскі ў інтэрв'ю з карэспандэнтам аднае польскае газэты закрануў і справу нацыянальных меншасьцяў Між іншым ён сказаў: „Урад можа апекавацца крэсамі ў меры сучасных палітычных магчымасьцяў Трэба падкрэсьліць добрую волю ўраду да меншасьцяў, якая выплывае з падставаў конституцыі: аднолькавае трактаваньне ўсіх грамадзян і заспакаеньне іх культурных, духовых і эканамічных патрэбаў.

Рад дэлегацыяў з усходніх земляў сцьвердзіў, што адносіны адміністрацыі да насяленьня зьмяняюцца на лепшае. Пры добрай волі *абодвых старон* можна чакаць стапнёвага зьліквідаваньня балючае праблемы нацыянальных меншасьцяў у Польшчы

Прадаўжэньне палявых судоў яшчэ на 6 месяцаў. Міністэрства выдала распараджэньне, якое прадоўжывае яшчэ на 6 месяцаў існаваньне палявых (doraźnych) судоў. Палявыя суды могуць прыгаварываць на кару сьмерці і ад іх прыгавораў німа ні апэляцыі ні касацыі.

Прамова міністра Заграні чных Справаў Залескага. Міністар Заграні чных Справаў Залескі сказаў у Сойме вялікую праграмную прамовы. З прамовы відаць, што Польшча перадусім імкнецца да спакою.

Ліквідацыя банкаў У сувязі з тым, што 31 сьнежня скончыўся срок, у якім банкі павінны былі павялічыць свой закладны капітал да аднаго мільёна зл, каля 20 малых банкаў будзе зьліквідавана.

Амністыя палітычным вязьням. Міністар Справядлівасьці загадаў перад Новым Годам—выпусьціць з Макатоўскага вастрогу ўсіх тых палітычных вязьняў, якім засталося дасядзець па некалькі месяцаў.

За граніцай.

Расстрэл комуністаў у Літве. Стары літоўскі ўрад зусім малую зьвяртаў увагу на комуністычны рух у краю. Ды і як было змагацца з комунізмам, калі падпісываліся дагаворы. з С.С.Р.Р. і літоўскія дыпляматы абменіваліся камплімэнтамі з савецкімі І ня дзіва што, комуністы гэтак абнаглелі—што аж дзяржаўны пераварот хацелі рабіць

Зусім інакш сталася, калі ўладу ўзялі ў свае рукі фашысты Літоўскай „керанщчыне“ прыйшоў канец. Фашысты - ведаючы да чаго давёў комунізм Расею, з каранямі вырываюць і зьніштажаюць свой комунізм. Гэтак ваенна — палявы суд у Коўні прыгаварыў 4 комуністаў на кару сьмерці. Не памагла інтэрвэнцыя Савецкага ўраду. Прысуд быў выканаы. Камэндант Коўні абвесьціў аб гэтым прадстаўнікам прэсы.

Падаўляючае ўражаньне зрабіла выкананьне прысуду ў Маскве.

Савецкая ўлада лічыць, што расстрэліваць можа толькі Г. П. У. а ў буржуазных дзяржавах гэтаму ня можа быць месца.

Выпушчана спэцыяльная адозва ад імя компартыі.

Чакаецца радыкальная зьмена ў адосінах Літвы з С.С.Р.Р.

Прывітаньне фашыстаў італьянскіх фашыстам літоўскім. Прэзыдэнт літоўскай рэспублікі Сметона атрымаў ад гэнэральнага сэкрэтара італьянскай партыі фашыстаў Туратті павінтаваньне з выражэньнем сымпатыі ад імяні італьянскіх фашыстаў фашыстам літоўскім.

Бунты ў С.С.Р.Р. На Салавецкіх вастравах узбунтаваліся чырвонаармейцы і матросы. Разгромлена турма. Каб усьмірыць бунтаўшчыкоў былі высланы спэцыяльныя атрады войск. Пры падаўленьні бунта забіта шмат людзей.

Надыйшлі весткі, што і на Украіне ня ўсё добра. Гэтак у некулькіх губэрніях распачаліся сялянскія непарадкі, выкліканыя гаспадарчай разрухай.

Чанг-Со-Лін — дыктатар Кітаю. З Пэкіна паведамляюць, што Чанг—Со—Лін маніцца абвесьціць сябе дыктатарам Кітаю.

Чанг—Со—Лін зьяўляецца ведамым праціўнікам бальшавікоў. Як ведама у арміі маршала Чан—Со—Ліна знаходзіцца вялікі атрад расейскага гэнэрала Нечаева, які складаецца выключна з расейскіх белых афіцэраў і казакаў.

Атаман Семёноў у Шанхаі. Нядаўна прыяджаў у Шанхай вядомы антыбальшавіцкі атаман гэн Семёноў які адбыў рад канфэрэнцый з японскімі і кітайскімі вайсковымі прадстаўнікамі Ен зазначыў, што мае замер узнавіць аружную барацьбу з бальшавікамі

Вайна ў Амэрыцы. У Нікарагуа ідзе цяпер хатняя вайна. Войска прэзыдэнта Діаца, стаўленьніка Злучаных Штатаў, разьбіта. Паўстанцаў падрымлівае Мэксыка.

Магчымым зьяўляецца паўстаньне канфлікта паміж Мэксыкай і Злучанымі Штатамі.

Кабінэтны крызіс у Нямеччыне. Нядаўна падаўся ў адстаўку нямецкі ўрад, на чале якога стаяў Маркс.

Цяпер ёсьць весткі, што арганізуе кабінэт ізноў Маркс.

Утварэньне украінскае камісіі пры Інстытуце Досьледу Нацыянальных Пытаньняў.

23 сьнежня, а гадз. 5 папалудні ў памешканьні Інстытуту Досьледу Нацыянальных Пытаньняў у Польшчы (Warszawa, ul. Jasna 19) адбыўся арганізацыйны сход Украінскае Камісіі Інстытуту. Вырашана, што прадметам дзейнасьці Камісіі маюць быць аб'ектыўныя навуковыя досьледы ў найважнейшых галінах украінскага жыцьця ў Польшчы і папулярызаваньне ведамасьцяў, датычачых украінскае меншасьці ў Польшчы пры помачы адпаведных лекцыяў і выданьняў. Камісія ня можа займацца палітычнымі пытаньнямі, што да спосабу разьвязаньня ўкраінскага пытаньня ў Польшчы, каб не зьвясьці гэтым прац Камісіі на шлях палітычных спрэчкаў, што не дало-б магчымасьці весьці той працы, для якой арганізавана Камісія.

Пастаноўлена падзяліць Камісію на 4 падкамісіі: 1) Палітычнага жыцьця ўкраінскае меншасьці, 2) Культурна-грамадзкую, якая будзе апрацовываць матэрыялы, датычачыя ўкраінскага школьніцтва, дзейнасьці ўкраінскіх навуковых, асьветных і грамадзкіх установаў, а таксама ўкраінскае літэратуры, 3) Гаспадарчую (гаспадарчае палажэньне ўкраінскага насяленьня, земляробскія адносіны, каапэрацыя, крэдытная палітыка, самаўрад і т. п. 4) Народаапісальная.

Паасобныя падкамісіі маюць гэткія заданьні: a) зьбіраньне матэрыялаў для архіва Інстытуту, b) апрацоўка паасобных пытаньняў і c) выдаваньне гэтых прац друкам.

Кожны сябра комісіі будзе абавязаны належаць хаця-б да аднэй з памянёных падкамісій.

Адначасна сход пастанавіў прыступіць да арганізацыі сеткі сябраў-карэспандэнтаў спасярод асобаў, якія жывуць па-за Варшавай, а асабліва на Валыні і ў Усходняй Малапольшчы, заданьнем якіх было б дастаўленьне матэрыялаў у галіне іх спэцыяльнасьці.

На сходзе было прысутных некалькі дзесяткаў польскіх і ўкраінскіх, грамадзкіх і палітычных дзеячоў.

Асобы, якія цікавяцца працамі камісіі няхай зьвернуцца да канцэлярыі Інстытута ў Варшаве.

Як мы даведываемся, у хуткім часе пры Інстытуце Досьледу Нацыянальных Пытаньняў у Польшчы, мае быць арганізавана і Беларуская Камісія.

Раскол у „Маладняку“.

Былі ўжо спрэчкі аб тым, ці можна лічыць творы падсавецкіх паэтаў і пісьменьнікаў сапраўды мастацкімі, — і гэта з той прычыны, што савецкія паэты у сваіх творах, праводзяць часта паміма волі комуністычную ідэолёгію і васьпеваюць чырвоных сатрапаў. Большасьць расейскіх вучоных і літэратурных крытыкаў дайшлі да таго вываду, што мастацтва і літэратурная творчасьць ня могуць свабодна разьвівацца пад Савецкай уладай. Савецкая ўлада вымагае ад пісьменьніка, каб той ня толькі не крытыкаваў яе, але каб хваліў яе, падлізываўся. У праціўным выпадку ён пісаць ня можа, бо яму сілком заткнуць горла. Дык паскольки пісьменьнікі і жывуць і пішуць у Саўдэпіі, аднак творы іх ня ёсьць мастацкімі. Яны носяць на сабе сьляды ўпіску і зьяўляюцца афіцыяльнымі. Чыстая-ж праўдзівая творчасьць павінна быць зусім свабоднай.-

Адзначым яшчэ адну, вельмі характэрную рысу падсавецкае літэратуры. Гэта яе інтэрнацыяналізм. Гэтая ўласьцівасьць падсавецкае літэратуры мае асабліва вялікае значэньне для нас — беларусаў. Бо некаторыя тутэйшыя пісакі з пад сьцягу „Справаў“ захлёбываючыся сіляцца даказаць, што там у Менску — кузьня Беларускае Культуры. Сапраўды-ж падсавецкая літэратура выяўляе, і то ня зусім праўдзіва, інтарэсы толькі аднае клясы—работніцкае, і то ня цэлае работніцкае — а толькі прывілеяванае часткі яе — комуністаў. Дык хіба што і ня можа быць мовы аб тым — каб Менск быў кузьняй Культуры Беларускага Народу, як пэўнай нацыі. Беларусы пераважна народ сялянскі. Шлях работніка і шлях сяляніна—розныя. Ня можа знача і спэцыфічна — комуністычны твор, з работніцкай ідэолёгіяй, — быць агульна беларускім.

* * *

Перад намі ляжыць журнальчык „Сталёвы Ўзьлёт“, менскага выданьня, прытарнаваны да трэцяе гадавіны „Маладняку“ — арганізацыі маладых беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў.

Раней чым прыступіць да агляду самага журнала, мусім адзначыць нейкую дзівоснасьць бальшавікоў і іх пісьменьнікаў, каторыя вельмі любяць ужываць словы: сталёвы, жалезны вагнявы і г. д. Гаворыцца напр.: жалезная, вагнявая брыгада. Ня ведаем — моў ў войску гэта і добра... Сталёвым мы можам назваць нейкі прадмет, напр. сякеру, але сталёвы ўзьлёт...

Бывае часамі ў некаторых, што ў галаве — тое і на языку... Будучы слабымі без, апоры і прызнаньня народу, бальшавікі самі сябе ашукваюць і і падбадраюць рознымі жалезнымі і сталёвымі значэньнямі.

„Сталёвы Ўзьлёт“ вельмі ясна даказвае нам, што пад бальшавікамі праўдзівага пісьменства, мастацтва для мастацтва ня можа быць. Мы ведаем, што да гэтага часу ўсе малацыя беларускія пісьменьнікі ў Усходняй Беларусі — былі згуртаваны ў „Маладняку“, які налічаў да 500 сябраў. Гожа будзе адзначыць, што паза „Маладняком“ — літэратурнай працы быць не магло. „Маладняк“ меў, свайго роду манаполь. Зусім зразумела, што маладнякоўцы верай і праўдай выслужываліся перад уладай, перадусім маючы на ўвазе свой асабісты дабрабыт. І толькі нядаўна ідэйная частка на чале са Зьмітраком Бядуляй, Дубоўкай, Пушчай і Бабарэкай выйшлі са складу „Маладняка“, арганізуючы „Узвышша“, сябры якога пачалі служыць праўдзіваму незалежнаму мастацтву, а выслугоўвацца перад уладай не сталі.

Пазастаўшаяся опортуністычная частка на чале з Чаротам (які зьяўляецца супрацоўнікам „Савецкай Беларусі“) і Дударом падняла з гэтай прычыны страшэнны шум. Не абыйшлося без закідаў у буржуазнасьці, мяшчанстве, кулачастве — аддзяліўшыхся.

У „Сталёвым ўзьлёце“ „Маладняк“ яскрава выявіў свае адносіны да „Узвышша“ і яго паасобных сябраў. Вельмі пікантна тое, што самі маладнякоўцы ня справіліся з „Узвышшам“, бо ім на помач прыйшлі прадстаўнікі ўлады, як Адамовіч, Крыніцкі і інш.

Добрая палова нумару запоўнена прывітаньнямі — „інструкцыямі“ для маладнякоўцаў гэтых дзеячоў і нам вельмі цікава будзе прывясьці гала-

Менскія бальшавікі аб Грамадзе — сваей філіі.

„Савецкая Беларусь“ у № 275 з 3-га сьнежня ў артыкуле „польскі фашызм штурмуе“ выступае ў абароне „Грамады“.—Нападаючы на урад маршалка Пілсудскага газэта кажа:

„Фашыстаўская дыктатура асабліва сурова ашчацінілася проціў радыкальнай „Беларускай *Рабоча—Сялянскай Грамады* („Рабоча“ на першым мейсцы! Рэд). Ідзе пляновы сыстэматычны разгром гэтае арганізацыі, стаўшай у апошвія часы магутным фактарам нацыянальнага і клясавага руху на Заходняй Беларусі Уся буржуазная прэса Польшчы некалькі месяцаў вяла самую гідкую хлусьню і паклёпы на Грамаду, падгатаўляючы грунт для рэпрэсіяў.

Ня было зьезду, нарады адміністрацыйных органаў, дзе на парадку дня не стаяла б пытаньне аб Грамадзе. І эндэкі падалі нават інтэрпэляцыю ў сойме, дамагаючыся ад ураду неадкладнай ліквідацыі Грамады. Урад прыступіў да гэтай ліквідацыі. Ня гледзючы на легалізаваны статут, Грамадзе *забараняюцца* мітынгі і зьезды. (?) *Нядаўна скліканы зьезд* (!) Вельскага павету быў разагнаны фашыстаўскімі бандамі (абуранымі сялянамі! Рэд.) пры дапамозе паліцыі. Нізавыя арганізацыі Грамады—гурткі ня маюць права зьбірацца (?), а за нарушэньне гэтага пастанаўленьня ўчасьнікі арыштоўваюцца, ці абкладаюцца непасільнымі штрафамі!

Побач з тым, як дэфэнзыва так і беларускія угадоўскія арганізацыі — Паўлюкевіч і К о — стараюцца справацыраваць Грамаду!... (Як бачым Беларуская Нацыянальная Рада мае „пашану“ня толькі ад сваіх таварышоў—грамадзістаў, але яе нацыянальная і антыбальшавіцкая праца непакоіць нават закардонных комуністаў! Рэд). Ідуць арышты актыву Грамады, каб зьняўшы кіраўнічы кадр, аслабіць і ліквідаваць арганізацыю“... Як бачым усё, слова ў слова як у „Белар. Справе“ Луцкевіча!..

А далей ужо трохі інакш...

„Фашыстаўская дыктатура штурмуе рабочых і сялян, накіроўваючы лязьвё галоўным чынам проціў *кіраўніка рэвалюцыйнага руху—компартыі*, якая стаіць па за законам, на расправу з якой даецца вольная рука і самачынныя дзействы ўсім уладам і фашыстаўскім арганізацыям (фашыстаўскія Паўлюкевічаўскія банды) Гайда на бальшавікоў! Бі комуністаў!.. Вось лёзунгі сучаснай Польшчы! Аднак на рэпрэсіі, на штурм, на ўдар фашыстаўскай дыктатуры, шырокія працоўныя массы адказваюць масавым адпорам.. У Зах. Беларусі сабрана 35.000 подпісаў з дамаганьнем вызваліць паднявольных барацьбітаў. *Збор подпісаў з пасьпехам ідзе далей.* Навагрудак, Слонім, Паставы, Гарадок і бадай усе мястэчкі і гарады Зах. Беларусі на сваіх мітынгах (зарганізаваных Грамадою! Рэд.), ня толькі *гучна і грозна выказывалі лёзунгі компартыі,* — але і далі належны адпор наскоку паліцыі. Вялікія пабеды лявіцы профсаюзаў на выбарах у касу хворых, як у Варшаве, Берасьці, Вільні, (№ 6, — Грамадаўскі! Рэд.) ярка сьведчаць аб тым, што рабочая кляса рэзка парывае з угодай, *ідзе пад сьцягам компартыі,* на барацьбу да пабеды проціў фашыстаўскай дыктатуры“.

Гэтак піша „Савецкая Беларусь“ орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Б.С.С.Р. — іначай кажучы орган безпасярэдняга начальства Грамады!

І як мы бачым вышэй, „Сав. Беларусь“ зусім адкрыта называе адзіным кіраўнікомрэвалюцыйнага (грамадаўскага! Рэд.) руху — компартыю!

Дык як жа, як не нагласьцю можна назваць заяву Луцкевіча (глядзі „Справу“) што кс. Станкевіч дапусьціўся правакацыі назваўшы Грамаду „зближонай да комунізму“. Ня „зближаная“, а проста *комуністычная, падпарадкаваная маскоўскім бальшавікам,* як можа неасьцярожна,а мо наўмысьля катэгарычна сьцьверджае орган Ц. В. Кам. Савецкай Беларусі.

Маленькі фэльетон.

У Менскім Трыбунале.

(*Працяг*).

Падсудны: (задумываецца) Па другому пункту... (прыкладвае руку і трэ лоб) Які-ж гэта другі пункт?!.. А! Валэйша!.. І недарма ён мне сёньня ўспомніўся!.. (Рашуча да судзей) Не!.. І па другому пункту ня прызнаю сябе вінаватым..

Старшыня: Калі ласка, прашу больш драбязгова азнаёміць нас...

Падсудны: (нэрвова) Далібог, паважаные судзі, гэта не я прыткнуўся да Валэйшы... Гэта ён з „абшарнікам“ прыткнуліся да мяне!.. Гэта яны ўвесь час пілі маю кровушку!... Гэта яны выдалі мае „Птушкі Шчасьця“, „Шчасьлівага Мужа“, а „Тэатры“...

Абвінавацель: (перабіваючы) А ці ня ваш гэта партрэт быў зьмешчаны у Валэйшаўскім Календары?!.

Падсудны: І далібог да гэтае пары яшчэ за кліша не заплацілі..

Голас з публікі: Бо дурны! Трэ' было грошы браць ўперад!..

Абвінавацель: А ці ня вы гэта ў свой час падтрымалі Валэйшу, калі ён актыўна пайшоў проці Пасольскага Клюбу?! Што?! Гэта ня вы?! Ах, Юрый Монвід!... Ну дык ці ня вы гэта пілі тамака лікёр абедзенымі лыжкамі з талеркаў?!.. Ах, хлябалі?!.. Я кончыў... (Садзіцца і пра сябе: вось мы пябе сёньня разхлябаем!)

Абаронца: (устае) Скажыце, калі ласка, падсудны, а ці ня быў у Валэйшаўскім Календары побач з вамі партрэт Астроўскага?!. Як, якога?! Ну таго, што ідэйна працуе!.. Вось, вось, што дом сабе збудаваў! — Ах, быў?!... Дзякую, дзякую!.. А ці ня той гэта самы Валэйша, які быў праз Антона Луцкевіча вызначаны Галоўным Камісарам па выбарам ад „шаснасткі“ ў Вільні?!.. Ах, той самы?!... Дзякую.. Я больш нічога... (Садзіцца і ў бок абвінавацеля: Ну што?! — Зьеў?!..)

Абвінавацель: (ўстае) А скажыце, падсудны, а ці шмат беларусаў было выбрана ў Сойм ад Вільні?! — Ах!... аніводнага?!.. Дзякую дзякую.. Я больш нічога... (Садзіцца і ехідна пазірае на абаронцу).

Галасы з публікі: Здрада! Далоў?!.. Паклікаць Жаўрыда!...

Падсудны: (пра сябе) што, што?!... Жаўрыда?!... (азіраецца навакол, бляднее і апускаецца) міліцэйскіе яго падтрымліваюць.

Старшыня (да экспэртаў па палякафільствуючаму пытаньню): Можа хто з экспэртаў мае якое запытаньне?!...

— Я маю!...—падняўся Міхась..

Старшыня: калі ласка, прашу..

Экспэрт Міхась: Скажы ты мне, дарагі мой Францішэк...

Старшыня: Прашу экспэрта памятаць, што тутака Суд і нямашака ніякіх дарагіх Францішкаў, а ёсьць толькі падсудны Францішэк Аляховіч...

Экспэрт Міхась: (да судзі) Выбачайце!... (да падсуднага) Скажыце мне падсудны Францішэк Аляхновіч-якую цяпер тамака больш п'юць гарэлку?! „Бачэўскага“ ці „Патоцкага“?.. Ах, „манапольку“?!—Дрэнь!!.. А ў колькі градусаў у 45 ці ў 40?! У 45?!—Зусім дрэнь!!., У 40—лепшая!... Я больш нічога... (Садзіцца і адным вокам пазірае то на судзёў, то на падсуднага...)

У публіцы сьмех і галасы: Брава Міхась!... Правільна!... Але ў 45 мацнейшая!...

Голас Любачкі: А я бы цяпер вішнёўкі добрай выпіла-б!...

Старшыня крякнуў і неяк пытліва паглядзеў на іншых судзяў..

Абвінавацель: А я прашу паважаны Суд аб перарыву... (выймае гадзіннік) і цяпер як раз на часе...

Абаронца: І я ад імя падсуднага прашу аб перарыве.

Сэкрэтары: І мы просім...

Галасы з публікі: і мы! і мы!... Як раз час камісарскі!...

Старшыня (пашаптаўшыся с судзямі, звоніць сярдзіта) Суд пастанавіў перарыву не рабіць... Прашу публіку захоўваць цішу і сваіх думак голасна не выяўляць... А экспэрта Міхася просім гэтакіх пытаньняў больш не задаваць падсуднаму... Разгляд справы ідзе далей... Хто яшчэ мае якое запытаньне?!..

— А я маю — падняўся экспэрт другі...

Старшыня: Калі ласка, але папераджаю, каб такіх дразьнячых запытаньняў ня было...

Экспэрт другі: Скажыце, падсудны, вось вы напісалі 3-ці акт „Паўлінкі“, а чаму-ж вы не маглі дакончыць і не дапісалі яшчэ 4-га акту?!..

Падсудны: далібог хацеў!.. Але Валэйша „з абшарнікам“ мяне папярэдзілі і дакончылі.. Гэта яны, як я казаў, увесь час пілі маю кровушку...

Экспэрт другі: Чаму гэта ў вашых п'есах, што вы тамака напісалі—ў „Пане Міністру“, у „Шчасьлівам Мужу“ і ў іншых усё з жыцьця буржуазнага, як той казаў—з лёгкіх авансікаў у лёгкім тоне... а чаму вы не пастараліся напісаць штось іншае, штось цікавейшае для нас, з жыцьця беларусаў з Заходняе Беларусі..

Падсудны: я... я.. (хапаецца за бакавую кішаню) я... дам адказ, але пасьля... ў канцы... (зіркае на абаронцу, а той задаволяныківае галавой..)

Экспэрт другі: я больш нічога...

— Я маю яшчэ запытаньне—ізноў падымаецца Міхась..

Старшыня: Прашу, але...

Экспэрт Міхась: Калі ласка, падсудны Францішэк Аляхновіч, скажыце мне як тамака маецца мой кум і прыяцель пасол Ярэміч?!...

Галасы з публікі: Далоў яго!... Ня трэба!...

Старшыня (звоніць) Апошні раз папераджаю экспэрта Міхася, што тутака ня мейсца для прыватных гутарак і што нікому з нас не цікава, як там маюцца вашыя прыяцелі...

Экспэрт Міхась: Ну дык я... больш нічога (садзіцца).

Старшыня: Ці ёсьць яшчэ якія запытаньні?!... Не?!... Прашу падсуднага перайсьці да 3-га пункту...

(Далей будзе).

Г—на.

Жыцьцё провінцыі.

Развал Грамады на Гарадзеншчыне.

У апошніх часах у некаторых гмінах гарадзенскага павету сяляне добра зразумелі, чаго варта Сялянска-Раб. Грамада, якая баламуціць сялян, абяцаючы і зямлю і школы і звальненьне ад падаткаў і г. д., але гэта толькі адны манлівыя абяцанкі, за якія правадырам прыдзецца паплаціцца...

Бо ж ведама ёсьць наіўнасьць селяніна беларуса, які паверыў і пайшоў за гэтымі недасьпеўшымі палітыкамі — пасламі, а нядаўна яшчэ безработнымі пачтальёнамі, якія за бальшавіцкія грошы вядуць да пагібелі і няшчасьця нашых цёмных сялян, а самі пьюць салодкія гарэлкі дый віна, седзячы ў найлепшых готэлях з пекнымі дзяўчатамі.. і сьмяючыся з беларускае дурасьці!

Ведама, адкуль жа яны возьмуць і далуць з сваей рэвалюцыйнай праграмай зямлю для нашых сялян? Хіба ад сваіх таварышоў — бальшавікоў з Савецкай Беларусі? Але ж там комуністы — начальства „Грама-

---

сы некаторых з іх, — бо мы наглядна, як лепш ня можа быць, бачым — што ў Саўдэпіі апрача вузка-партыйнае комуністычнае літэратуры — іншае быць ня можа. Гэтак „вялікая шышка“ Крыніцкі прапануе „Маладняку“:

„Шчыльна ўвязвацца ў палітычную працу і барацьбу рабочае клясы, комсамолу, комуністычнае партыі“.

„Маладняк“ павінен выхоўваць сваіх сябраў у духу дыктатуры пралетарыяту і пралетарскай лініі ў літэратуры“.

„Маладняк“ расьце не зважаючы на размовы простых і несьвядомых ворагаў яго пралетарскае тэндэнцыі (мова ідзе аб „Узвышшы“. Рэд), не зважаючы на размовы прыхільнікаў „нэйтральнае“, пазаклясавае „літэратуры,—чыстага мастацтва“.

Відаць „таварышу“ Крыніцкаму вельмі не падабаецца тое, што мы разумеем пад літэратурай. У „Сталёвым узьлёце“ ёсьць вершык Дудара, які пэўне будзе па густу Крыніцкаму:

Над намі ноч,
За намі
Дзікі гнеў.
Мы ворагам дары не панясем у прыполе,
Нам вораг сьпіны не сагне...
... Мінаюць дні
Мінаюць і хвіліны.
І прыдзе час —
Апошні страшны бой,
Калі ізноў наш вырай сакаліны
Падымецца над панскай галавой...

Далей Крыніцкі піша:

„Жадаю „Маладняку“ п е р а в ы х а в а ц ь тых сваіх таварышоў, якія яшчэ не адмовіліся канчаткова ад рэшткі н я ў в а ж л і в ы х а д н о с і н д а к о м с а м о л у (папроста вышлі з „Маладняка“, які таксама комсамол. Рэд.) у якім праўда ш м а т н е д а в о л і к у л ь т у р н ы х і н е д а в о л і п і с ь м е н н ы х м а л а д ы х р а б о ч ы х і с я л я н“...

Нам адразу паказалася нешта падазроным, што ў Менску знайшлося аж 500 пісьменьнікаў і паэтаў, якія ўсё захацелі папасьці на Парнас. А тут аказваецца, што яны ня ўсе даволі пісьменныя і даволі культурныя!... Мо, знойдзецца і такі, што расьпісацца ня ўмее! Дык і ня дзіва, што больш уталентаваныя асобы паўцякалі ад комсамольскае някультурнае пошкудзі, гэтых падгалоскаў комуністычнай партыі і падхалімскіх прыдворных песьняроў чырвоных валадароў. Зусім зразумела і тое, што сапраўды уталентаваныя пісьменьнікі не захацелі дзяліцца славай з таўпой графаманаў, сапраўдным рамяством каторых зьяўляецца.. шавецтва або кравецтва...

Гэтыя словы Крыніцкага аб няпісьменных пісьменьніках вельмі характэрныя — яны кідаюць сьвятло на тыя ўзаемаадносіны ў Саўдэпіі, якія пануюць там дагэтуль: г. ё. што шавец прыраўнаваны да паэта. І словы нашых дамарослых комуністаў, што гэта было даўней, а цяпер інакш, вельмі ж ужо лёгка зьбіваюцца заявай камісара Крыніцкага.

Але вернемся да галоўнае тэмы. Нейкі Ліманоўскі ў г э т ы м жа нумару „Сталёвага узьлёту“ гэтак кажа аб адзяліўшыхся ад „Маладняка“ паэтах. Ен заве іх дэкадэнтамі і даводзіць, што ня кожная „якасьць“ буржуазнае літэратуры будзе якасьцю для пралетарскае літэратуры. Гэта знача, гаворыць ён, што „пралетарскі паэт не павінен гнацца за тэхнікай (?), дасканальнасьцю літэратурнага твору. Перад пралетарскай літэратурай стаяць зусім іншыя праблемы, чымся перад літэратурай буржуазнай. Напрамак „мастацтва для мастацтва“ ёсьць безпраблемны“. І гэтак Ліманоўскі сіліцца даказаць, што літэратура павінна быць практычнай г. ё. каб літэратура служыла некаму. Сябры „Узвышша“ і гавораць — практыцызм у творчасьці немагчымы, бо пісьменьнік ня можа дасканаліцца ў сваёй творчасьці, бо практыцызм накладае на яго путы і ён ня можа быць песьняром чыстае красы.

Па Ліманоўскаму гэта і ёсьць дэкадэнствам. З яго словаў відаць, што пралетарскім пісьменьнікам ня так ужо і трудна зрабіцца. Тэхнікі, вышуканасьці, дасканальнасьці ня трэба. Адным словам—калі выругаўся крапчэй як іншыя, дык ужо і паэт. Ня дзіва, што шаўцы ў Саўдэпіі парабіліся паэтамі.

Барыс Рмурскі.

(*Працяг будзе*).

ГРАМАДЗЯНЕ!

Беларуская Нацыянальная Рада выдала і разаслала па ўсіх беларускіх кутках адозвы ад 16 Жніўня і 2 Лістапада, у якіх абрысаваўшы праграму і дзейнасьць пралетарска — бальшавіцкае „Грамады“ папераджала грамадзян перад тою небясьпекай, якая пагражала ўсім тым, хто запішацца ў гурткі „Грамады“. Аднак жа, на жаль, засьлепленыя салодкімі абецанкамі „Грамады“ сяляне спачатку не зьвярнулі належнае ўвагі на перасьцерагаючы голас сваей Нацыянальнай Рады, бо надта ж салодка пеялі правадыры „Грамады“ абецаючы сялянам даравую зямлю, родную школу, самаўрады і, нарэшце, даць „вялікшае шчасьце“ — бальшавіцкі работніцка—сялянскі ўрад.

Прайшлі месяцы... Няма абецанай „Грамадою“ зямелькі... Няма і школы, няма самаўраду... Ня чутно і работніцка — сялянскага ўраду... За тое колькі сялян за рэвалюцыйную дзейнасьць грамадаўскіх правадыроў сядзіць па турмах! Сколькі непатрэбнага гора і сьлёз дабаўлена і да гэтак цяжкага лёсу беларускага селяніна... Пралілася і беларуская кроў... Подлаю рукою грамадаўскіх забойцаў былі забіты з-за вугла найболып нацыянальна—сьвядомыя сяляне—Іголка і Скарына.

І вось народ адумаўся. Засьляпеньне спала з яго вочаў. Ен, нарэшце, убачыў, што апрача ашуканьня, гора і бяды яму нічога іншага не дала і не дасьць бальшавіцка — пралетарская „Грамада“. І тутака ён прыпомніў аб перасьцерагаючым голасе Беларускае Нацыянальнае Рады, якая яшчэ 16 Жніўня папераджала яго. Абураны народ стаў гнаць з сваіх вёсак грамадаўскіх агэнтаў і агітатараў, нанятых за бальшавіцкія даляры. Гурткі пачалі самі сабой разваліваацца, а сяляне хутка з іх выпісваацца. Гэтак развалілася ўжо 14 гурткоў „Грамады“ у пав. Несьвіскім у вёсках: Цэпра, Заполье, Сабачкі, Лагвінавічы, Драбоўшчына, Міткевічы, Малыя Астроўчыцы, Камлеўшчына, Галузы, Стараселье, Бабаевічы, Нарэшавічы, Вялікі Карацк і Дунайчыцы, 2 — у Слонімскім вёсках Махначы і Петралевічы і 1 у Наваградзкім павеце у м. Дзятлаве і што дзень з розных куткоў паступаюць у Раду ўсё новыя весткі аб развале гурткоў. Абурэньнеж народу на рэвалюцыйных грамадаўскіх паслоў, якія ашуківаюць народ і пхаюць яго на рэвалюцыю, а самі пры першай жа небясьпецы уцякаюць заграніцу ў Гданьск,—дайшло да таго, што 5 Сьнежня г.г. у вёсцы Стараберэзаве Бельскага павету абураны народ на паветовым зьездзе „Грамады“, пабіў і выкінуў з салі грамадаўскіх паслоў Валошына і вядомага прыяцеля бальшавікоў—Мятлу, і разагнаў усіх грамадаўцаў са зьезду.

Аднак жа ня ўсюды яшчэ наступіла адцьвярэзеньне. У тых мейсцох, куды не дайшоў перасьцерагаючы голас Рады, сяляне яшчэ часьці чакаюць ад „Грамады“. А маладыя, гарачыя вясковыя хлопцы на стараму равалюцыйна выступаюць паводле інструкцыяў грамадаўскіх правадыроў. Але пачаўшыйся развал ня ўстрымае ўжо ніякая сіла. Народ зразумеў, што шляхам узаемнай барацьбы і забойстваў родных братоў, ашуканствам і правакацыяй ён не здабудзе лепшае долі. Што адзіным шляхам для зьдзейсьненьня нашых нацыянальных імкненьняў і папраўкі лёсу нашага Народу ёсьць нацыянальнае адзінства ўсяго Беларускага Народу, а не клясавая барацьба пад камандаю 3-га Інтэрнацыяналу, куды прэ Народ „Грамада“.

Дык, Грамадзяне! Бярыце прыклад з тых найбольш сьвядомых сялян, якія ўжо скінулі з сябе атручанае зачараваньне „Грамады“.

Ліквідуйце гурткі і ўплывайце на тых сялян, якія да гэтага часу яшчэ адураны „Грамадою“. Стойце моцна за свае нацыянальныя і сацыяльныя правы. Трэбуйце правядзеньня зямельнае рэформы роднай школы, праудзівага самаўрад, зьмяншэньня падаткаў, гаспадарчай дапамогі і г. д. але ня пішыцеся ў пралетарскія грамадаўскія гурткі і жаніце ад сябе грамадаўскіх агэнтаў і агітатараў. Еднайцеся каля сваей Нацыянальнай Рады і яе органаў на мяйсцох. Падтрымлівайце Раду ў яе барацьбе з лепшую долю нашага Народу. У гэтай еднасьці Народу з сваей Нацыянальнай Радай, выбранай агульным зьездам, будзе вялікая сіла, якая дасьць магчымасьць асягнуць усіх належных нам правоў.

БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ РАДА

Вільня, 5 Студня 1927 г.

ды“ раздаюць зямельку беларускую асаднікам — жыдам, а беларусаў высяляюць на Сыбір. Дык, можа і нашым сялянам Грамада зьбіраецца даваць“ зямлю ў Сыбіры ??

Гэтак сама і са школамі. Чаго ж яны нас навучаць, калі яны самі нічагусенькі ня ведаюць, апрача таго як лісты развасіць, дый яшчэ цэрквы ламаць?... Каму ж мы паверылі, за за кім мы пайшлі? За гэтымі платнымі агэнтамі, бальшавікамі якія самі лоўка ўстроіліся, бо напрыклад старшыня горадзенскага камітэту Шушкевіч атрымлівае ў месяц аднэй пэнсіі 260 зл., сэкрэтар Паддубік 160 зл. і скарбнік Баравічанка 100 зл. А што ж мы атрымліваем? бязплатную „Народную справу“, дый арышты і штрафы! Што датычна гурткоў, дык толькі паслухайце, з каго яны складаюцца! *У вескі Гаўкі*, Скідэльскай гміны *старшыня „гуртка“ Васіль Салей краў плугі*, хамуты, вазы, але ж цяпер папаўся *і сядзіць ў вастрозе*, дзякуючы чаму на вёсцы цяпер спакойна. У в. Некрашах Скідэльскай гміны, дык *сябры гуртка* паступаюць як праўдзівыя *бандыты*. Па аўторкам у м. Скідэлі адбываюцца кірмашы, дык гэтыя „гурткоўцы“ прычапляюцца да першага лепшага селяніна і крычаць: мы грамадаўцы, грошы ня маем, дык пастаў нам таварыш бутэльку“... А калі хто не дасьць, дык галаву пабьюць! У в. Савалеўцы яшчэ горш, проста *„грамадаўцы“* жыць не даюць: *бьюць, крадуць* што папала. Гэтак у Рыгора Казла за тое, што не хацеў упісацца ў Грамаду, грамадаўцы ўначы *манеж пабілі*; у Адолі Гарошко, беднай беззямельнай удавы, уначы праз вакно *ўкралі* апошнюю швэйную машыну; у *в. Курнікі* Жыдамлянскай гміны, дык *крадуць* што папала: *куры, сыры бульбу* з ямаў і г. д. Дзеля гэтых фактаў сяляне добра зразумелі, чаго варты гэтыя „гурткі“, гдзе сядзяць альбо адны зладзеі альбо ашуканыя дурні і пачалі ўжо проста разганяць уласнымі сіламі „Грамаду“. Гэтак меўся адбыцца сход у Савалеўцах і Курніках Жыдамлянскай гм. дык ня толькі сяляне, але *бабы* выступілі проціў і сходы *разагналі*, абзываючы грамадаўцаў бандытамі, злодзеямі, пасьля чаго многія выступілі з Грамады і ня хочуць мець нічога больш супольнага з Грамадою. Гэтае самае робіцца ўва ўсей Жыдамлянскай, Скідэльскай і часты Лунінскай гміны. Таксама разьбягаюцца „гурткі“ ў Вяліка-Есьмантаўскай гміне Горадз. павету, дзе ўжо арыштавалі аднаго старшыню гуртка, а старыя людзі даўно ўжо гаварылі і праклінalі гэтую Грамаду, ведаючы добра, што простыя сяляне потым будуць пакутаваць за сваю неасьцярожнасьць, паверыўшы розным ашуканцам.

О. З-я.

Поўны развал і ліквідацыя гурткоў „Грамады“ ў Несьвіскім павеце.

Пад уплывам мейсцовых сябраў Беларускай Нацыянальнай Рады ачышчаецца зусім ад гурткоў Грамады павет Несьвіскі. Гэтак у дадатак да паданых раней зьліквідаваных гурткоў у Дунайчыцах, В. Карацку, Нарэшавічах і Бабаевічах зьліквідаваны наступныя гурткі: *гміна Грыцэвіцкая — в. Цэпра, в. Заполье, в. Дамарацк і в. Сабачкі, гміна Заастравецкая — в. Лагвінавічы, в. Драбоўшчына, в. Галузье, в Комлеўшчына, в. Міткевічы, в. Малыя Астроўчыцы і в. Староселье*, разам у павеце Несьвіскім зьліквідавана Нацыянальнай Радай 15 гурткоў. Усе выходзячыя з Грамады клянуць яе і кажуць, што ніколі мець ня муць з ею нічога супольнага. Якія прычыны выхаду — характэрызуе заява старшыні гуртка в. Дамарацку *Івана Дамарацкага* (партыйны білет № 20793 і пасьведчаньне Грамады № 4017) які пры выхадзе *заявіў*, што выходзіць з Грамады дзеля таго, што бачыць, што Грамада *арганізацыя чыста комуністычная*, у якую яго ўцягнулі ашуканствам.

Вашы Сябры

АД РЭДАКЦЫІ. Мы пэўны, што ўсьлед за слаўным Несьвіскім паветам, які ня раз ўжо даказваў сваю нацыянальную сьвядомасьць і аддансьць беларускай справе, як напр. злажыўшы у прошлым годзе дэклярацыяў школьных больш, як усе іншыя паветы і даўшы на настаўніцкія курсы ў Вільню ажно 12 настаўнікаў — пойдуць і іншыя паветы Наваградчыны, ліквідуючы комуністычна інтэрнацыянальныя гурткі „Грамады“ і ўсімі сіламі падтрымліваючы свае нацыянальныя беларускія арганізацыі.

Ахвяры Грамады.

(Лебедзева, Маладэчанскага пав.)

І да нашае ваколіцы завітала комуністычная Грамада. Як у Лебедзеве, гэтак і ў яго ваколіцах шыбка пачалі арганізоўвацца грамадаўскія гурткі. Сяляне спачатку цікавіліся ею — думаючы, што гэта партыя зусім легальная і як казалі грамадаўскія інструктары, сябрам яе нічога не пагражае.

Аднак аказалася ня так. Праца тутэйшых гурткоў аказалася ня зусім легальнай. Так у в. Дамашох арыштаваны *грамадаўцы* Белька і Семашкевіч, абвінавачаныя ў тым, што вывесілі на гасьцінцы, які вядзе з Лебедзева да Маладэчна, чырвоныя штандары *з комуністычнымі напісамі*.

Старшыня гуртка ў в. Лабачоўка сядзіць 80 дзён у вастрозе за незаконнае склікаtньне сходу.

Гэткую самую кару атрымаў грамадаўскі сэкрэтар Семашкевіч.

Тое самае робіцца амаль па ўсіх вёсках.

Дык цяпер ужо пачаўся адліў з Грамады. Бо і каму ахвота за пустыя абяцанкі згубіць гаспадарку.

Лебедзеўскі

Грамадаўскія фатаграфіі.

Старшыня гуртка ў Лебедзеве Іларыён Юрэвіч быў арыштаваны яшчэ пры немцах за крадзеж тэлефонных слупоў і дроту. Невядома, што з ім было-б — але немцы якраз ужо адступалі і гэта яго ўратавала.

Спраўка да „фатаграфіі гурткоўцаў“ у в Селявічы, Міжэвіцкай гм. Слонімскага пав.

1) *Сьцяпан Серкевіч.*
2) *Міхась Серкевіч* (Б. чэкіст.)
3) *Антось Рэшка*, з месяцы турмы за крадзеж.
4) *Уладзімер Быцько*—2 гады прымусовых работ.
5) *Янка Рэшка*, адміністрацыйна караны, мае 18 гадоў.
6) *Я Фенкевіч*, прыйшоў з турмы.
7) *Паўлюк Серкевіч*—сядзіць у турме 129, 130 ст. К. К.
8) *Франц. Серкевіч* — быўшы канфідэнт, цяпер заядлы комуніст. Ад 30. XII. „жыве“ ў Слонімскай турме.

Рэкорд брахні.

Агідная шмата „Наша Справа“ ў № 1/10 зьмяшчае карэспандэнцыю з *Кругавіцкай гміны, Слонімскага пав ?!*

Як брахаць, дык ужо трэба добра брахаць, а не пашкудзіць „Справы“...

Сцьвярджаем, што, ў Слонімскім павеце зусім німа Кругавіцкай гміны.

А мо скора „Наша Справа“ надрукуе карэспандэнцыю з ... Марса або Юпітэра?!

Тутэйшая хроніка.

ПАВАРОТ АРХІМАНДРЫТА ПІЛІПА МАРОЗАВА ў ПРАВАСЛАЎЕ.

Ведамы арганізатар уніі архімандрыт Піліп Марозаў гэтымі днямі вярнуўся ў праваслаўе.

Свой пераход у праваслаўе Піліп Марозаў гэтак матывуе ў пісьме да каталіцкага архіепіскапа Ялбжыкоўскага:

„Для мяне асабіста цяпер зусім ясна, што іменна з боку прадстаўнікоў Заходняе Царквы няма эвангэльскай падгатоўкі для злучэньня цэркваў. У каталіцкай ерархіі няма сапраўды каталіцкіх адносінаў да праваслаўя, г. ё. у духе Сусьветнае Хрыстовае Царквы, і наадварот: гордасьць, самадумства і нястача хрысьціянскае любві — характэрызуюць гэтыя адносіны...

... Карыстаньне ў каталіцкай прапагандзе духоўнымі асобамі, выкінутымі з праваслаўя, як адпадкі (wyrzutki Cerkwi i społeczeństwa rosyjskiego, — гл. „Przegląd Wileński“ за 28.XI—1926 г. № 20), — карыстаньне імі толькі дзеля таго, што яны на ўсё згодны і з прыемнасьцю могуць кідаць балотам у праваслаўе, — ясна сьведчыць аб тым, што каталіцкія ерархі ня толькі ня хочуць закапаць вырытай чалавечымі рукамі пропасьці паміж цэрквамі, але пры помачы нанятых работнікаў яе паглыбляюць“.

У пісьме да праваслаўнага архіепіскапа Хвядоса Піліп Марозаў просіць прыняць яго прастым манахам да Сьв. Духава манастыра.

НОВЫЯ АХВЯРЫ ГРАМАДЫ.

У Наваградку арыштаваны старшыня паветовага камітэту Грамады М. Чатырка і сэкрэтарка камітэту К. Гоцко.

Усяго арыштованы ў Наваградчыне больш за 50 грамадаўцаў.

Запярэчаньне.

У комуністычнай шмаце „Наша Справа“ ад 10 XII. 26 г. № 5 была надрукована заметка, быццам нехта з грамадзян „засадзіў у вастрог“ нявіннага вучыцеля Серкевіча з в Селявічы, Слонімскага пав.

Сцьвярджаем, што ніхто з грамадзян не засаджываў у вастрог гэтага Серкевіча, а справа вось як была:

Паўлюк Серкевіч, ведамы ўсім комуністычны дзеяч і агітатар Грамады 3. VII. 26 г. сабраў па вёскам банду хлапцоў яго ідэалёгіі з якімі пайшоў у Слонім. У Слоніме прылучыліся яны да комуністычнага паходу і пачалі пяяць „інтэрнацыянал“ і інш. комуністычныя песьні.

Паліцыя пачала разганяць таўпу. Тады комуністы пачалі кідаць каменьнямі ў паліцыянтаў, што рабіў і Серкевіч, якога пасьля паліцыянты пазналі і тут-жа арыштавалі.

Сьледчы судзьдзя ў Слоніме пасадзіў яго ў турму, гдзе дагэтуль сядзіць ...

З турмы гэты Серкевіч шле пагрозы па адрасу некаторых грамадзян, што як выпусьцяць яго, дык.. заб'е 2 з в. Селявічы.

Трэба гэтаму таварышу прыпомніць: „хто мячом ваюе—ад мяча згіне!“...

Бязпрэчна можа забіць 2 мухі на сьцяне...

Подпісы.

Адказны Рэд. Т. Вернікоўскі. Друк. Новочэсна Вільня Біскупья 12. Выдавец і Бел. Нацыянальная Рада.